8. Установы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь па стану на пачатак 2014/2015 навучальнага года. – Минск, 2014. – 246 с.
9. Высшее образование Республики Беларусь. Информационное и нормативно-методическое обеспечение приема в учреждения высшего образования в 2015 г. Справочник. – Минск: РИВШ, 2015. – 235 с.
10. Моисеев, Н.Н. Избранные труды: в 2 т. / Н.Н. Моисеев. – М.:Тайдекс Ко, 2003. – Т. 2. – 262 с.

## СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАФСАЮЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БССР У ПЕРЫЯД НЭПА

Дубовік А. А. г. Мінск, БНТУ

Сярод праблем гісторыі вышэйшай адукацыі Беларусі, якія не атрымалі належнага асвятлення ў навуковай літаратуры, знаходзіцца ўдзел навукова-педагагічнай інтэлігенцыі ў грамадскім жыцці, у прыватнасці ў прафсаюзным руху.

Пытанне аб формах прафесійнага аб’яднання навукова-педагагічнай інтэлігенцыі паўстала ў пачатку НЭПа. Яно абмяркоўвалася на пленуме ЦК прафсаюза працаўнікоў асветы 22 красавіка 1921 г. Большасць выступаўшых у спрэчках падтрымала прапанову УсеЦСПС аб стварэнні масавай прафесійнай арганізацыі, якая б, па выразу вядомага гісторыка М.М. Пакроўскага,“сцэменціравала” ўсіх вучоных і выкладчыкаў вышэйшай школы. Ён жа прапанаваў для назвы арганізацыі тэрмін “навуковы работнік” [1, с. 220]. 23 красавіка пленум ЦК прафсаюза Працасветы зацвердзіў Палажэнне аб секцыі навуковых работнікаў (СНР). Згодна з ім, у СНР уваходзілі навуковыя работнікі, якія знаходзіліся ў галіновым прафсаюзе Працасветы. Асноўныя задачы СНР – клопат аб павышэнні прафесійнай падрыхтоўкі іх членаў, удзел у вырашэнні пытанняў нарміравання і аплаты працы навуковых работнікаў, пошук мер да паляпшэння іх матэрыяльнага становішча, прадстаўніцтва ў савецкіх установах [2, с. 3; 3]. 21 чэрвеня 1921 г. рашэннем УсеЦСПС ствараецца пры ЦК саюза часовае Цэнтральнае бюро (ЦБ) СНР на чале з вядомым вучоным А.К. Ціміразевым. Праца ЦБ СНР вялася ў двух накірунках:

прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем матэрыяльнага становішча вучоных і выкладчыкаў, стварэнне секцый на месцах і падрыхтоўка да з’ездаў вучоных.

СНР пры прафсаюзе працаўнікоў асветы Беларусі арганізавалася 4 кастрычніка 1921 г. Спачатку ім кіравала часовае бюро, выбранае на сходзе ініцыятыўнай групы [4, арк. 34]. Яго старшынёй быў выбраны вядомы вучоны-філосаф, намеснік дэкана факультэта грамадскіх навук БДУ С.Я. Вальфсон [4, арк. 7; 5]. Стварэнне СНР мела вялікае значэнне. Яна збірала і сістэматызавала матэрыялы аб становішчы навукова-педагагагічных работнікаў, што выкарыстоўвалася потым для прапаноў па паляпшэнні ўмоў іх працы і быту. У канцы лістапада 1923 г., калі ў Маскве адбыўся І Усесаюзны з’езд навуковых работнікаў, беларуская секцыя аб’ядноўвала большасць (110 з 205) навукова-педагагічных работнікаў Мінска. На ўсесаюзным з’ездзе яна была прадстаўлена двумя дэлегатамі. З’езд прызнаў СНР у складзе саюза Працасветы адзінай мэтазгоднай формай прафесійнага аб’яднання работнікаў навукі, што стала добрым стымулам для ўмацавання СНР на месцах, адыграла важную ролю ў прафесійнай кансалідацыі навукова-педагагічнай інтэлігенцыі. Зробленыя па вяртанні беларускіх дэлегатаў даклады аб рабоце з’езда выклікалі вялікую цікавасць, на сходах прысутнічалі да 500 работнікаў асветы і навукі [4, арк. 33–34].

Пасля ўсесаюзнага з’езда прыступілі да стварэння пастаяннага бюро СНР Працасветы Беларусі. Яно было выбрана 20 снежня 1923 г. у складзе прадстаўнікоу з трох асноўных цэнтрау навукі і вышэйшай адукацыі Мінска: БДУ, Беларускі інстытут сельскай гаспадаркі і Інстытут беларускай культуры. У сваёй рабоце бюро СНР падтрымлівала самую цесную сувязь з праўленнем саюза Белпрацасветы, старшыня СНР з’яўляўся членам яго прэзідыума.

Са стварэннем прафсаюзнай арганізацыі навукова-педагагічнай інтэлігенцыі, у задачы якой уваходзіла праца па паляпшэнні ўмоў працы і быту навуковых работнікаў, паўстала пытанне аб мэтазгоднасці існавання мясцовых камісій па паляпшэнні быту вучоных (КПБВ), якія займаліся арганізацыяй спецыяльнага забеспячэння (прадуктовыя пайкі, надбаўкі) вучоных, паляпшэннем жыллёвых умоў, санаторнай дапамогай. ЦК саюза Працасветы краіны на пленуме ў верасні 1922 г. прызнаў мэтазгодным

захаванне Цэнтральнай КПБВ у Маскве, але непатрэбнымі КПБВ на месцах, іх функцыі прапаноўвалася перадаць мясцовым СНР [1, с. 180–182]. Агульны сход навуковых работнікаў Мінска прызнау, што далейшае існаванне БелКПБВ нараджае паралелізм у рабоце і толькі тармазіць дзейнасць СНР. Пытанне было ўнесена ў СНК БССР, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі КПБВ. У красавіку 1924 г. БелКПБВ передала свае функцыі СНР пры Белпрацасветы [6, с. 15].

Паказчыкам працы прафесійнай арганізацыі навукова-педагагічнай інтэлігенцыі з'яўляўся рост колькасці яе членаў. Калі на 1 кастрычніка 1923 г. беларуская секцыя навуковых работнікаў налічвала 76 членаў, дык на 1 студзеня 1926 г. – 384. Гэтаму садзейнічала і першае ўзбуйненне БССР, у выніку якога ў склад беларускай СНР уліліся навукова-педагагічныя работнікі Горы-Горацкага сельгасінстытута (тут аддзяленне СНР было створана яшчэ ў сакавіку 1922 г.), Віцебскага педінстытута, Аршанскага педфака. СНР стала істотным і ўплывовым фактарам грамадскага жыцця рэспублікі, у яе ўваходзілі амаль усе дзеячы навукі і вышэйшай адукацыі Беларусі [7, с. 9].

У маі 1924 г. на І Усебеларускай канферэнцыі навуковых работнікаў быў выбраны Цэнтральны савет секцыі. Ім было выдзелена Цэнтральнае бюро, якое складалася з 7 членаў і знаходзілася ў Мінску пры Цэнтральным праўленні прафсаюза Працасветы. У склад бюро ўваходзілі прадстаўнікі Мінскага і Горацкага аддзяленняў. З 1925 г. структура бюро СНР была прадстаўлена трымя камісіямі, якія адлюстроўвалі асноўныя накірункі работы секцыі: тарыфна-эканамічнай, кваліфікацыйнай і культурна-асветнай. У тарыфна-эканамічнай камісіі была сканцэнтравана абарончая работа – пытанні аплаты працы, жыллёвай і курортнай работы, аховы здароўя. Кваліфікацыйная камісія вырашала пытанні прыёму новых членаў у секцыю, займалася размеркаваннем іх на катэгорыі для атрымання забеспячэння па лініі Цэнтральнай КПБВ. Культурна-асветная камісія займалася арганізацыяй культурна-масавай работы сярод членаў секцыі і насельніцтва.

Асноўнымі пытаннямі, якія займалі ўвагу бюро секцыі, былі павышэнне заработнай платы і санаторная дапамога. Бюро СНР прымала актыўны ўдзел ва ўсіх камісіях па пытаннях заработнай платы і ў асабліва важных выпадках звярталася за падтрымкай у Саўнаркам БССР, які звычайна ішоў насустрач секцыі. Калі ў та-

рыфных пытаннях беларуская секцыя кіравалася ўказаннямі ЦБ СНР Працасветы СССР, дык у справе санаторнага абслугоўвання спачатку была прадастаўлена самой сабе – субсідый, месцаў у санаторыях усесаюзныя арганізацыі рэспублiцы не прадастаўлялі. У 1925 г. бюро СНР узняла пытанне перад СНК БССР аб датацыі на курортнае лячэнне і на навуковыя камандзіроўкі. Пытанне было вырашана станоўча: атрымана датацыя, якая дала магчымасць паслаць на курорты 50 чалавек (прыкладна 22% членаў СНР) і 10 вучоным прадаставіць субсідыі на навуковыя камандзіроўкі (у тым ліку 6 чал. – за межы краіны). Станоўчы вынік намаганняў бюро ўзняў аўтарытэт секцыі ў вачах навукова-педагагічных работнікаў і садзейнічаў згуртаванню іх вакол сваёй прафесійнай арганізацыі [8, с. 85–86].

Пасля II Усебеларускай канферэнцыі ў кастрычніку 1925 г. была пачата падрыхтоўка да адкрыцця "Кутка вучоных" як пераходнай ступені да Дому вучоных. Цікавасць з боку навукова-педагагічных работнікаў да гэтага пачыну была даволі вялікая. Увагу праявіла і кіраўніцтва рэспублікі, асабліва Старшыня ЦВК БССР А.Р.Чарвякоў. "Куток вучоных" адчыніў дзверы пры Цэнтральным Доме работнікаў асветы ў студзені 1926 г. Бюро СНР імкнулася да таго, каб ён стаў цэнтрам грамадска-палітычнага і навуковага жыцця. Пры вялікай актыўнасці была праведзена дыскусія "Аб шляхах інтэлігенцыі", у ёй прынялі ўдзел кіраўнікі ўрада. Значна ажывілася праца аддзяленняў СНР у Горках і Віцебску. Асабліва ўмацавалася і развіла вялікую дзейнасць Горацкае аддзяленне, якое ў 1926 г. налічвала 120 членаў. Павелічэнне адбылося за кошт зліцця Горацкага і Мінскага сельскагаспадарчых інстытутаў у Беларускую сельгасакадэмію. Да дня яе ўрачыстага адкрыцця быў прымеркаваны праведзены ў Горках пленум Цэнтральнага савета СНРБелпрацасветы. З адкрыццём у Віцебску Беларускага дзяржаўнага ветэрынарнага інстытута актывізавалася дзейнасць Віцебскага аддзялення СНР [8, с.88–90].

Паказчыкам узрослага аўтарытэту СНР Працасветы з'явілася выбранне яе членаў у савецкія органы. Так, у Мінскі гарадскі савет было выбрана 10 членаў секцыі. У рабоце VII Усебеларускага з'езда Саветаў у маі 1925 г. удзельнічала 8 членаў, у ЦВК БССР выбраны 4 члены СНР [8, с. 90]. У студзені–лютым 1927 г. у Маскве адбыўся II Усесаюзны з'езд навуковых работнікаў. У склад Цэнтральнага

савета СНР СССР быў выбраны прадстаўнік беларускіх вучоных С.Я. Вальфсон. Услед за гэтым, 27 лютага – 2 сакавіка 1927 г. у Мінску праходзіў III Усебеларускі з'езд навуковых работнікаў. Прысутнічала 29 дэлегатаў, якія прадстаўлялі больш за 400 вучоных рэспублікі [9].

8 чэрвеня 1927 г. пастановай СНК БССР быў зацверджаны нарматыўны акт – "Палажэнне аб навуковых працаўніках вышэйшых школ і навуковых устаноў БССР", які рэгламентаваў парадак назначэння і звальнення, прысваення навуковых званняў і матэрыяльнага забеспячэння навуковых працаўнікоў рэспублікі. У лістападзе 1927 г. было створана Беларускае таварыства работнікаў навукі і тэхнікі для садзейнічання сацыялістычнаму будаўніцтву (Белтарнітса), дзейнасць якога накіравана на далучэнне навуковых супрацоўнікаў і спецыялістаў да актыўнага ўдзелу ў распрацоўцы праблем гаспадарчага і культурнага будаўніцтва [6, с. 22–24].

На агульных сходах навуковых працаўнікоў і на пленумах савета СНР абмяркоўваліся пытанні развіцця навукі і адукацыі ў рэспубліцы, у прыватнасці арганізацыі тэхнічных ВНУ. Прадстаўнікі СНР ўдзельнічалі ў пасяджэннях Калегіі Наркамата асветы, Дзяржплана і іншых органаў, якія вырашалі гэтыя пытанні. У галіне бытавога абслугоўвання секцыя дамаглася правядзення пастановы СНК БССР аб паляпшэнні забеспячэння навуковых працаўнікоў прамысловымі таварамі, арганізавала ў Мінску сталовую і г.д. [10, с.118]. Акрамя таго, Мінскае аддзяленне СНР выдавала са спецыяльнага фонда пазыкі сваім членам ад 20 да 100 рублёў. Горацкае аддзяленне СНР адкрыла сталоўку для сваіх членаў [8, с. 86].

Стварэнне новых ВНУ і асабліва адкрыццё з 1 студзеня 1929 г. Беларускай Акадэміі навук садзейнічалі значнаму павелічэнню колькасці членаў СНР Белпрацасветы. У 1930 г. секцыя налічвала ўжо 712 чалавек. Беларусы складалі 40% (288 чал.). Большасць (82,2%) членаў секцыі былі беспартыйнымі. Па адукацыі члены СНР размеркаваліся наступным чынам: 97,2 % закончылі ВНУ; 0,3% – Інстытут чырвонай прафесуры; 0,4% – РАНІАН; 2,1% – сярэднія спецыяльныя ўстановы; 13,6% з'яўляліся аспірантамі. Па спецыяльнасцях размеркаванне членаў СНР выглядала так: аграномы складалі 27,4 %, урачы – 21,1%, педагогі – 14,2 %, гуманітарыі – 12,4 %, біёлагі – 6,3 %, тэхнары – 4,9%, фізікі і матэматыкі – 3,9%,

юрысты – 3,9%, эканамісты – 3,5%, працаўнікі мастацтва – 1%, ваеннаслужачыя – 1,5% [10, с. 104–105].

На жаль, выкананню статутных задач СНР перашкаджаў яе ўдзел ў розных гаспадарча-палітычных кампаніях, што патрабавалі дырэктыўныя органы ў час згортвання НЭПа. У канцы 20-х гг. вялікую значнасць набыла арганізацыя спаборніцтва. Удзел у ім прымалі і навуковыя працаўнікі: былі заключаны дагаворы Беларускай акадэміі навук з Украінскай акадэміяй, Беларускай сельгасакадэміі ў Горках з Маскоўскім заатэхнічным інстытутам, педфака БДУ з факультэтамі Маскоўскага і Ніжагародскага ўніверсітэтаў. Разгорнута таксама спаборніцтва паміж аддзяленнямі СНР у Горках і Віцебску. Цэнтральнае бюро секцыі стварыла 8 брыгад для праверкі арганізацыі спаборніцтва ў ВНУ [6, с. 30; 10, с. 117–118]. У гэты складаны час устанаўлення ў краіне каманднаадміністрацыйнай сістэмы дзейнасць СНР моцна палітызавалася, была накіравана на барацьбу з “правым апартунізмам” і “нацыяналдэмакратамі”. IV з’езд навуковых работнікаў БССР (люты 1929 г.) у прынятай рэзалюцыі даручыў выбранаму Цэнтральнаму бюро секцыі “рашуча змагацца з рознымі рэкцыйнымі нацыяналдэмакратычнымі настроямі сярод прафесуры” і выказаўся за больш шырокае прыцягненне навуковых работнікаў да грамадскапалітычнай работы [11]. На ўстаноўчай канферэнцыі Усесаюзнай арганізацыі таварыства работнікаў навукі і тэхнікі для садзейнічання сацыялістычнаму будаўніцтву падвергся крытыцы і нападам прадстаўнік беларускай дэлегацыі прафесар У.І. Пічэта, які заявіў, што ў БССР “сярод навуковых работнікаў няма праціўнікаў нацыянальнай палітыкі. Няма правага лагера, пра які тут казалася, і магчыма ў гэтым дачыненні беларуская арганізацыя прадстаўляе сабой выключэнне”. Гэта ацэнка становішча ў БССР там жа на канферэнцыі была ўзята пад абстрэл шматлікіх дэлегатаў, якія весьма іранічна аднесліся да таго, што “існуе такая Беларусь, у якой няма ні класавай барацьбы, ні правых, ні левых, а пануе цішыня ды супакой” [10, с.114]. Па сфабрыкаванай ДПУ справе аб “Саюзе вызвалення Беларусі” у 1930 г. быў арыштаваны шэраг членаў СНР, у тым ліку два члены Цэнтральнага бюро СНР Белпрацасветы [10, с. 118].

У першай палове 1930-х гг. былі ажыццёулены буйныя рэарганізацыі ў прафсаюзах краіны. Так, з саюза Працасветы было

арганізавана восем новых прафсаюзаў, у тым ліку саюз работнікаў вышэйшай школы і навуковых устаноў (ВШіНУ). Разам з тым, у гэты перыяд у прафсаюзнай рабоце адбыўся значны спад, узмацніўся фармалізм, парушаліся прынцыпы прафсаюзнай дэмакратыі, справаздачнасці і выбарнасці праворганаў. З канца 1931 г. не перавыбіраліся Цэнтральны савет СНР і бюро мясцовых секцый. У лістападзе 1939 г. на II з'езде саюза ВШіНУ было заяўлена аб "немэтазгоднасці далейшага існавання секцый навуковых работнікаў, паколькі камітэты саюза паспяхова спраўляюцца з усёй сукупнасцю вучэбных і метадычных пытанняў" [7, с.12]. Прафсаюз ВШіНУ СССР існаваў да 13 красавіка 1953 г., калі ўвайшоў у склад прафсаюза работнікаў культуры. У кастрычніку 1957 г. быў створаны прафсаюз работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў краіны. На сучасным этапе, ва ўмовах незалежнасці Рэспублікі Беларусь, навукова-педагагічная інтэлігенцыя рэспублікі абслугоўваецца Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі, які ўваходзіць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі.

**Выкарыстанай літаратура**

1.Иванова, Л.В. Формирование советской научной интеллигенции (1917–1927 гг.) / Л.В. Иванова. – М.: Наука, 1980. – 392 с.
2. Коржихина Т.Т. Общественные организации в СССР. 1917 – 1936 (профсоюзы интеллигенции). – М.: МГИАИ, 1984. – 98 с.
3. Положение о Секции научных работников Всеработпроса //Работник просвещения. – 1921. – № 4–5. – С. 33–34.
4. НАРБ. – Ф. 306. – Воп. 1. – Спр. 53.
5. Дубовик, А.К. Научная и общественная деятельность С.Я. Вольфсона / А.К. Дубовик, Е.А. Дубовик // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси (к 90-летию создания Инбелкульта). Материалы Междунар. научн. конф. – Минск, 2012. – С.392–398.
6. Наука и техника Советской Белоруссии в 1917–1990 гг. Хроника важнейших событий. – Мн.,1991. – 189 с.
7. Дубовик, А.К. Создание и деятельность профессиональной организации научной интеллигенции Беларуси (20–30-е гг. XX века) /А.К.Дубовик, Е.А. Дубовик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2007. – № 4. – С.8–13.

8. Липец, И.М. О деятельности Белорусской секции научных работников / И.М.Липец // Научный работник. – 1926. – № 3. – С. 83–90.
9. НАРБ. – Ф. 306. – Воп. 1. – Спр. 280. – Арк. 32, 76.
10. Прокопчук, А. Итоги деятельности Белорусской секции научных работников /А. Прокопчук // Научный работник. – 1930. – № 11–12. – С.104–118.
11. Съезды и совещания // Научный работник. – 1929. – № 3. – С. 97–98.

## ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ СТРУКТУРЫ И КАДРОВОГО ПОТЕНЦИАЛА БГУ В 1926-1941 ГГ.

Ершова О. И. г. Минск, БНТУ

В 1926 г. Белорусский государственный университет отметил свое пятилетие. Партийно-советские лидеры БССР высоко оценили его вклад в дело строительства социалистического государства. Руководство же самого БГУ охарактеризовало статус учебного заведения следующим образом: «… ун-т з'яўляецца ў сучасны момант вялікім культурным асяродкам Беларусі, які ня толькі падрыхтоўвае кваліфікаваных працаўнікоў для культурна-гаспадарчага адраджэння Сав. Беларусі, але і вядзе шырокую палітасветную працу. Ун-т з працягам часу стаў настолькі папулярным, што збірае ў сваіх мурах ня толькі моладзь Сав. Беларусі, але прыцягвае да сябе і закардоннікаў-беларусаў...» [5, с. 222]. Однако это были только первые шаги на пути становления БГУ как центра формирования интеллектуальных сил Беларуси.

Во второй половине 1920-х гг. изменения, отражавшие политическое и экономическое развитие БССР, претерпела университетская структура. В 1925/26 уч. году из четырех факультетов БГУ (рабочего, общественных наук, педагогического, медицинского) был ликвидирован один – факультет общественных наук. Вместо него открылся факультет права и хозяйства, на котором сконцентрировалась подготовка для республики экономистов и юристов. Он состоял из юридического и экономического отделений. Экономическое отделение делилось на три цикла: административно-промышленный, кооперативный и банковско-финансовый. Будущие специалисты проходили практику в судебных и хозяйственных уч-